ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 1 2007
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

*УДК 392.4+392.5](=826)(091)*

*Н. Я. ЛУЙГАС*

# ДАШЛЮБНАЕ ЗНАЁМСТВА МОЛАДЗІ І ШЛЮБ У БЕЛАРУСАУ У XIX ст.

Стварэнне сям'і з’яўляецца адной з самых важных падзей у жыцці чалавека. На скрыжаванні маральных каштоўнасцей, якія передаюцца з пакалення ў пакаленне, адбываецца фарміраванне новага фундаменту для будауніцтва маладой сям’і. Яго трываласць шмат у чым залежыць ад таго, што было пакладзена у падмурку: якія мадэлі ўзаемаадносін складваліся паміж бацькамі і дзецьмі, прыярытэт якіх каштоўнасцей быў вызначаны у бацькоўскай сям'і, як выкарыстоўвалі судзаныя назапашаны вопыт сямейнага жыцця старэйшага пакалення і інш.

Каб рэканструяваць, у якіх абставінах адбывалася знаёмства моладзі сялянскага асяродку мінулага стагоддзя, выявіць выкрышталізаваныя правілы штодзённай маралі і іх уплыў на фарміраванне этыкету дашлюбных паводзін хлопца і дзяўчыны, прааналізаваць умовы заключэння шлюбу ў беларусаў прывілеяванага і простага саслоўя, варта звярнуцца да этнаграфічных і статыстычных матэрыялаў у спалучэнні з аналізам асобных артыкулаў дзяржаўнага і звычаёвага сямейнага права.

Вясковая моладзь мела нямала шансаў для знаёмства падчас сумесных работ у полі, народных святаў, абрадаў, мясцовых прысвяткаў. Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Купалле спрыялі ўсталяванню новых кантактаў праз сумесны актыўны адпачынак: катанне на санях, ваджэнне карагодаў, калядаванне, танцы пад спевы альбо музыку і г. д.

У якасці спрыяльнай магчымасці паказаць сябе і паглядзець на другіх моладзь выкарыстоўвала храмавыя святы, якія ў некаторых паветах называліся «кермашамі», дзе адбываўся «і выбар жаніхамі нявест і наадварот па ўзаемнай іх згодзе і сардэчнай схільнасці». Падчас іх падтрымліваліся старыя і заводзіліся новыя знаёмствы. Сюды збіраліся і мясцовыя, і жыхары з аддаленых вёсак. Хлопцы прыносілі з сабою грошы (плата для музыкаў), а дзяўчаты закусю, каб разам пад’есці і адпачыць пасля царкоўнай службы [1, с. 188].

Месцамі знаёмства для прадстаўнжоў шляхецкага салоўя былі балі, сямейныя вечарыны, кірмашы з нагоды выбараў дваранства. Апошнія на Палессі атрымалі назву кантрактаў, падчас якіх наладжваліся рэдуты ці рэсурсы — нешта накшталт збораў для танцаў. «Кажуць, што ў рэсурсах часцяком рашаецца лёс не адной палескай паннанчкі, якая плянілася якім-небудзь ягамосцем (гаспадзінам) пасэсарам ці кобрынскім дэндзі [2, с. 10].

Нярэдка беларуская карчма збірала на сямейныя ўрачыстасці старых і маладых. З ёю, па сутнасці, была звязана рэалізацыя народных юрыдычных звычаяў у працэсе фарміравання новай сям'і — тут жаніх выбірае сабе нявесту, у карчме бываюць змовіны і запоіны, сюды накіроўваецца вяселле пасля вянца. А. Ф. Лісоўскі згадвае звычай, калі бацькі наладжваюць у карчме святкаванне з нагоды першага дня Святога Духу, загадзя наймаюць музыкаў, і вольны час, такім чынам, набывае двайную карысць: знаёмства і танцы для моладзі, абмеркаванне за чаркай гарэлкі прыватных і фамадскіх пытанняў для бацькоў [1, с. 18—20].

Месцам магчымых сустрэч хлопца і дзяўчыны з розных вёсак былі прошчы, якія назы- валіся 1мёмам1 хрысціянскіх святых і знаходзіліся звычайна ў глухім месцы, лесе, сярод дрыгвы, ля крыніцы. П. Шпілеўскі у мясцовым нарысе «Маладзіковая нядзеля» згадвае крывіцкую прошчу Мінскай губерні Слуцкага павета вёсю Юрывічы, куды збіраўся набожны люд блі- жэйшых ваколіц памаліцца Святой Пакравіцельніцы Божай Маці [3, с. 42—49].

Адметна, што адкрыццё прошчы было звязана з народнымі паданнямі пра незвычайную падзею ці праяўленне на пэўным месцы цуда. «Ісці на прошчу» — сінонім «ісці на багамолле». Крыніцы, старажытныя крыжы, «пісаныя камяні», горкі станавіліся месцамі маленняў і прынашэнняў. М. Я. Янчук падчас паездкі па Мінскай губерні у 1886 годзе згадвае Мар’іну горку ў Ігуменскім павеце, Святую горку каля мястэчка Смілавічы таго ж павета. У заходніх ускраінах, асабліва ў Віленскай губерні, месцамі пакланення былі камяні з адбіткамі чалавечай нагі, што ўспрымаліся ў народзе за сляды Багародзіцы. Нароўні з імі шанаваліся «пісаныя камяні» — з незразумелымі надпісамі. Калі скласці спіс падобных прошчаў па ўсёй губерні, на думку аўтара, іх аказалася б дзесяткі, калі не сотні. Духавенства ўрэшце рэшт вымушана было прымаць прошчы пад сваю апеку: там будавалася каплічка, само месца асвячалася, служыліся малебны, а дробныя гандляры ў багамольныя дні завозілі туды розны тавар (посуд, прыправы, цацкі), наладжвалася нешта накшталт кірмашоў [4, с. 189—193].

У Беларусі ўвогуле было распаўсюджана знаёмства і шлюб моладзі адной ці суседніх вёсак. У Мінскай губерні Барысаўскага павета Красналуцкай воласці звычайна адбывалася знаёмства сярод моладзі адной вёсга, бо дзяўчыны рэдка і неахвотна выходзілі замуж у далёкую ад роднай старонку. Трываласцю гэтай тэндэнцыіі тлумачыцца і тая з'ява, што у некаторых пасяленнях усе карэнныя жыхары носяць адно прозвішча,

напрыклад, Рабуевічаў ці Багадзяжаў. Часам і сама вёска атрымлівала назву ад імя агульнага роданачальніка — Іванкаўшчына, Маісееўшчына [1, с. 190—191].

Найбольш тыповым месцам маладзёжных гуртовак былі вячоркі. У адрозненне ад гаманлівых і вясёлых ігрышчаў вячоркі праходзілі ў больш спакойнай абстаноўцы. На гэтых сустрэчах наладжваліся сяброўскія адносіны паміж хлопцам і дзяўчынай, якія маглі перарасці ў каханне. Кожны мог падсесці да дзяўчыны і паразмаўляць, пажартаваць з ёю. Норма этыкету не дазваляла дзяўчыне адмовіць хлопцу ў размове, пакрыўдзіць яго грубым словам. Адметна, што сяляне ставіліся да наведвання вячорак іх дзецьмі як на ўсталяваны дзядамі абрад, выкананне якога замацавана звычаем. Нярэдка сама маці выпраўляла на вячоркі дачку і была вельмі засмучана, калі дзяўчына не жадала іх наведваць і, наадварот, была вельмі задаволена, калі дачка карысталася мужчынскай увагай.

Чысціня дашлюбных палавых зносін сярод моладзі ў XIX ст. адлюстравалася, напрыклад, у маральнай норме, зафіксаванай у Мінскай губерні Барысаўскага павета Красналуцкай воласці. У паведамленні валаснога пісара С. Пракулевіча адзначаецца існуючы мясцовы звычай хаджэння хлопцаў і дзяўчат улетку і ўвосень «на ночкі» ў сенныя пуні для сумеснай начоўкі альбо так званыя парныя «на ночкі» па папярэдняй згодзе: «Як, відаць, непрадузяты з маральнага боку гэты звычай, але ён зрэдку прыводзіць да сумных для дзяўчыны наступстваў, бо здаўна служыць сродкам збліжэння моладзі абодвух палоў у вёсцы» [1, с. 190].

М. В. Доўнар-Запольскі напрыканцы XIX ст. фіксуе змену бацькоўскіх поглядаў на дашлюбнае інтымнае збліжэнне моладзі пасля вячорак. Раней падначоўкі мелі характар сяброўскіх заляцанняў і не прыводзілі да трагічных наступстваў для дзяўчыны (цяжарнасці), таму бацькі не перашкаджалі дачцэ і рупіліся на словах папярэдзіць непажаданыя вынікі зносін. Нярэдка сустракалася, калі два ці тры хлопцы, якія заляцаліся да дзяўчыны, падначоўвалі разам з ёю. З цягам часу, калі захісталіся асновы старога бытавога жыцця ў выніку пранікнення капіталістычных адносін у вёску, дашлюбнае палавое збліжэнне прыводзіла да страты дзяўчынай цнатлівасці без гарантаванай магчымасці шлюбу. Падобныя з'явы аднесены даследчыкам да наступстваў новых павеваў. Парушальнікамі звычаяў этнограф называе падга- роднія вёсю, дзе бацькі адважваюцца пярэчыць хаджэнню дзяўчыны на вячоркі, а дашлюбныя падначоўкі тут як новая тэндэнцыя не прыводзяць да стварэння сям'і [5, с. 290].

Народны погляд на цнатлівасць суджаных быў даволі моцным да канца XIX ст. Так, у прыватнасці, у віленскіх сялян распаўсюджаным меркаваннем з'яўлялася тое, што нявінная нявеста прыносіла ў хату мужа благаславенне Гасподне, а яе цнатлівасць адпаведна лічылася свяшчэнным сімвалам. Падчас вяселля ў маладой бачылі ўвасабленне будучага дабрабыту і шчасця. І наадварот, тая дзяўчына, якая саграшыла да замужжа, несла з сабою вечны разлад з той прычыны, што сваякі па лініі мужа (свякроў, сёстры мужа) не мелі да яе пэўнай павагі. У такіх выпадках няшчасную не заўсёды маглі выратаваць ад кпінаў і сварак яе больш заможны матэрыяльны дастатак ці апека гаспадарскага дома [6, с. 149].

Аналагічныя погляды сялян у патрабаваннях да нявесты выяўляюцца і ў Мінскай губерні Барысаўскага павета Красналуцкай воласці. Добрая гаспадыня, фізічна здаровая дзяўчына-працауніца з сумленнымі паводзінамі, не гуляшчая і не зганьбаваная мела больш шансаў выйсці замуж, чым дзяучына з процілеглымі якасцямі. «Увогуле ўвага пераважна звяртаецца на здароўе і дароднасць, а матэрыяльны бок не мае вялікага значэння» [1, с. 188].

У Гродзенскай губерні Лашынскага прыходу дашлюбныя праступкі дзяўчыны часам караліся ўніяцкімі святарамі праз публічную ганьбу. Напрыклад, былы псаломшчык І. Карскі згадвае выпадак, калі ў 1847 годзе дзяучына-сялянка, нарадзіўшы пазашлюбнае дзіця, прыйшла ў царкву на саракавы дзень, каб памаліцца. Святар, даведаўшыся пра незаконнанароджанага, паклаў на галаву маладой маці вянок з гарохавай саломы і загадаў абвесці яе тры разы вакол царквы, а пасля прывязаць да дрэва, што расло паблізу, і пратрымаць тры гадзіны ў такім становішчы [1, с. 188].

Прыгадваючы лёсы равесніц, А. Я. Багдановіч падае трагічную панараму жыцця халопенічскіх дзяучат: нанятыя ў пакаёўю да мясцовых панічоў, як і горнічныя ў гарадах, яны звычайна нараджалі пазашлюбных дзяцей без перспектывы замужжа, а тыя, хто заставаўся ў Халопенічах, своечасова не маглі выйсці замуж. Прычына пагалоўнай дашлюбнай страты цнатлівасці дзяўчатамі бачыцца этнографу не ў разбэшчанасці нораваў і не ў падзенні маральнасці з боку нявест, а ў змене гаспадарскіх абставін з-за прані кнення капіталістычнага ўкладу ў вёску: адсутнасць заробка, магчымасці фінансава падужэць і завесці ўласную сям'ю. Моладзь беднаты часцей не мела шансаў быць замужам без пасагу. На думку А. Я. Багдановіча, справа не ў тым, што дзяўчаты былі «сапсаванымі», а ў тым, што яны былі беднымі, не захоўвалі сябе з-за таго, што не маглі своечасова выйсці замуж. У выніку становішча бачылася мемуарысту такім, што хлопцы былі, а жаніхоў не было [7, с. 122].

Адзначаючы трансфармацыю народных поглядаў на конт маладзёжных узаемаадносін, М. В. Доўнар-Запольскі фіксаваў безумоўнае патрабаванне дашлюбнай цнатлівасці дзяўчыны і паўсюднае выкананне пасаду нявесты падчас вяселля. Апошняе выяулялася ў тым, што зганьбаваная дзяўчына не апаганіць свяшчэннага месца і адпаведнага абраду, не сядзе на дзяжу ці «ўслон» альбо лаўку, засланую вывернутым кажухом. Бацькі таксама папракнуць маладую, спалучаючы мацярынскія слёзы і развітальныя бацькоўскія пабоі.

С. Пракулевіч паведамляе, што ў вясельным рытуале большай часткі Беларусі захоўваўся пасад жаніха, і да хлопца прад'яўлялі аналагічныя патрабаванні: ён не меў права сесці на пасад, калі быў не цнатлівы. Асабліва строга адпаведныя патрабаванні выяўляліся ў Мінскім, Ігуменскім, асобных мясцовасцях Рэчыцкага павета [5, с. 292].

Ва ўсходніх раёнах Беларусі, на Смаленшчыне, ужо ў сярэдзіне XIX ст. у асяродку простата народа адзначалася паслабленне тэндэнцыі заключэння шлюбаў бацькамі жаніха і нявесты, якія раней мала клапаціліся пра ўзаемныя пачуцці дзяцей: «У цяперашні час жаніх і нявеста ведаюць адзін аднаго, і жаданне ці нежаданне іх быць разам прымаецца часам да ўвагі бацькамі ці старэйшымі сваякамі» [8, с. 291].

Пошук нявесты быў напрамую звязаны з набыццём патэнцыяльнай дапамогі ў гаспадарцы. Таму зразумела, што бацькі, заводзячы размову пра жаніцьбу, кіраваліся не столькі жаданнямі і пачуццямі маладых, колькі неабходнасцю падтрымаць, а часам і замяніць аслабеўшыя працоўныя рукі ў асноўных гаспадарскіх занятках.

Як адзначае Ю. Ф. Крачкоўскі, у сялянскім асяродку пытанне пра жаніцьбу ўзнімаецца зыходзячы з таго, што бацькі далі жыццё дзецям і павінны паклапаціцца, уладкаваць іх. Паўналетні сын у сям'і не раз чуе пра намер жаніць яго. Часам бацькі пытаюцца ці ёсць на прыкмеце нявеста і раяць выбіраць добрую працаўніцу:

Оженися, сынку, возьми собе жонку,
Возьми собе жонку хоць вдавину доньку;
Только самавольницы не бяры,
И нашой хаты не разары,
А бяры ты работницу.
Которая бы дом свой шановала,
Дом свой сберегала,
А не то, чтобы спиной угол подпирала,
И нас старых за воротник на бел свет вытолкала! [9, с. 12].

Калі ж бацькі выбіралі сыну нявесту, у такім выпадку размова пра ўзаемныя пачуцці не заводзілася. Зафіксаваныя ў фальклорных матэрыялах трагічныя лёсы суджаных даюць падставу Ю. Ф. Крачкоўскаму зрабіць вывад пра тое, што падобныя шлюбы вельмі рэдка прыносілі шчаслівае сямейнае жыццё з-за ўнутранага разладу. Але, на нашу думку, нельга катэгарычна ўспрымаць гэту выснову, бо спрактыкаваны бацькоўскі вопыт хутчэй за ўсё выкарыстоўваўся не дзеля таго, каб пашкодзіць ці наўмысна сапсаваць лёс свайму дзіцяці, а каб дапамагчы не памыліцца ў выбары.

У тым выпадку, калі вяселле рыхтавалася па ўзаемнай згодзе двух пакаленняў, бацькі загадзя прасілі добрых знаёмых параіць ці засватаць працавітую дзяўчыну. Акрамя гэтага, і сам хлопец не сядзеў у пасіўным чаканні, а часцей наведваў ігрышчы, досветкі, вячэрніцы, павялічваючы такім чынам шанцы для выбару нявесты [9, с. 14].

Зразумела, што жыццёвыя калізіі больш разнастайныя і пачуццёвыя ўзаемаадносіны паміж мужчынам і жанчынай разбуралі іерархічныя бар'еры, парушалі жорсткую грамадскую рэгламентацыю абрысаў сямейнага жыцця шляхты і сялянства. Пра гэта сведчыць наяўнасць асобных артыкулаў Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 года, у якіх прадугледжваліся маёмасныя санкцыі ў выпадку парушэння прынцыпаў саслоўнай роўнасці, чысціні шлюбных стасункаў. Адзначым, што Статут дзейнічаў на Беларусі да 1831 г. у Віцебскай і Магілёўскай і да 1840 г. — у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях, таму варта звярнуцца да юрыдычна замацаваных нормаў сямейнага права.

Праяўленне асабістай волі дзяўчынай-нявестай у дашлюбны перыяд было даволі праблематычным у плане наступстваў як для прадстаўніц прывілеяванага, так і простата саслоўя. Так, у прыватнасці, артыкул восьмы Статута ВКЛ 1588 г. прадугледжваў пазбаўленне пасагу, бацькоўскага і мацярынскага маёнткаў, нават спадчыны ў тым выпадку, калі дзяўчына ішла замуж без згоды бацькі і маці. А калі непаслухмяная была адзінай у бацькоўскай сям'і, то нават яе дзеці павінны былі быць пазбаўлены маёмаснай базы. Таму згода бацькоў на замужжа дзяўчыны — першы крок на шляху атрымання пасагу і спадчыны. Аналагічнае безальтэрнатыўнае становішча дзяўчыны паўставала ў выпадку яе апекі, калі «самавольна не павінна ні за каго ісці» пад пагрозай адчувальных маёмасных санкцый. Толькі ў выпадку шлюбу з шляхціцам, а не з чалавекам простага саслоўя за ёю захоўвалася маёмаснае права [10, с. 404]. Дазвол сваякоў і выбар, адпаведны свайму саслоўю, — умовы паўторнага шлюбу нават для ўдоў. У выпад¬ку іх парушэння жанчына каралася пазбаўленнем бацькоўскіх маёнткаў і спадчыны [10, с. 405].

Аднак 39-ы артыкул 3-га раздзела дэклараваў свабоду выбару для «княгінь, паней, удоў, княжон, панен, дзевак, шляхцянак і іншых сасловій вольных людзей» жаночага полу. На¬прыклад, магнатам, якія мелі залежную шляхту, не дазвалялася прымусова аддаваць шляхця¬нак замуж. Воля пачуццяў жанчыны павінна была распаўсюджвацца выключна на выбранцаў таго ж шляхецкага саслоўя [10, с. 372].

У выпадку шлюбу шляхціца з нешляхцянкай Статутам 1588 г. прадпісвалася павышэнне сацыяльнага статуса як самой выбранніцы так і яе будучых дзяцей, бо яны станавіліся прадстаўнікамі прывілеяванага саслоўя. Аднак воля праяўлення пачуццяў у бок зніжэння іерархічнай лесвіцы кантралявалася ўладай і царквой: калі жанчына другі раз выходзіла замуж за мужчыну простага саслоўя, ёй пагражала страта набытай шляхецкай годнасці [10, с. 367].

Царкоўнае вянчанне прымалася афіцыйным правам за падставу для выяўлення ўзаемаадносін паміж мужчынам і жанчынай. Артыкул 28 3-га раздзела Статута 1588 г. абмяжоўваў магчымасці палюбоўніц, бо дзеці з нявенчанай жонкай лічыліся незаконнанароджанымі нават і ў тым выпадку, калі такая жанчына пасля смерці законнай жонкі афіцыйна станавілася другой жонкай. Прыжытыя з ёю дзеці пасля жаніцьбы, гэтак як і тыя распусныя (ад пазашлюбнай сувязі), не дапускаліся да маёнткаў і маёмасці бацькі [10, с. 368].

Такім чынам, у акрэсленай праблеме свабоднага выбару падчас стварэння сям'і ў прывілеяваных колах праглядваецца мінімум двухбаковая (жаніх-нявеста) барацьба маральных поглядаў (бацькі-дзеці), цесна

звязаная з маёмаснай перспектывай. Перад вырашэннем гэтай дылемы ў аднолькавай ступені бышi пастаўлены трынаццацігадовыя дзяўчыны-шляхцянкі і жанчыны, якія ўжо мелі сваіх дзяцей. Наступствы праяўлення асабістай волі, паводле Статута 1588 г., маглі адчуць не толькі нявеста, але і яе нашчадкі. Адметна, што і ў сведчаннях этнографаў мінулага стагодцзя дамінуюць заўвагі аб прагматычнасці, разліку бацькоў у працэсе вырашэння лёсу дзяцей у сялянскім асяродку і адваротнае імкненне маладых да свабоды распараджэння асабістымі пачуццямі. «Шлюбы па любві паміж сялянамі ў Віленскай губерні — рэдкая з'ява. Часцей бацькі між сабою складаюць праекты ажаніць сваіх дзяцей, да таго ж амаль заўсёды разлік адыгрывае важную ролю» [6, с. 143].

У залежнасці ад тыпу сям'і — вялікая ці малая — назіраюцца больш кансерватыўныя адносіны паміж бацькамі і дзецьмі ў першым выпадку і дэмакратычныя ў другім. «Як хлопец, так і дзяўчына ў вялікай сям'і падпарадкоўваюцца таму выбару, які зробяць старэйшыя. Існасць пытання заключаецца або ў прыцягненні ў сям'ю новага працаўніка, або ў тым, што сям'я павінна страціць працоўныя рукі» [11, с. 154].

М. В. Доўнар-Запольскі фіксуе змену парадкаў у адносінах да выбару маладых, калі хло¬пец патрабуе ад бацькоў засылаць сватоў да той дзяўчыны, з якой ён любіцца. «У малой сям'і, дзе кожны працаўнік вельмі дарагі, дзе пачуцці бацькоў да дзяцей маюць больш прасторы ў сваім развіцці, маладыя людзі дасягаюць сваіх патрабаванняў. Але ў вялікіх сем'ях, дзе агульны рэжым вышэй за пачуцці, дзе падпарадкаванне асобнага члена «гаспадару» (бальшаку) мацней, — там яшчэ і зараз хлопца жэняць, а дзяўчыну выдаюць замуж без увагі іх жаданняў» [5, с. 291].

У цыкле артыкулаў А.Шумовіча, прысвечаных вясельным звычаям і абрадам простанародцзя Барысаўскага павета Мінскай губерні, аўтар сцвярджаў, што шлюб з'яўляўся не столькі жыццёвай неабходнасцю, колькі патрэбай у свежых жаночых або мужчынскіх сілах для падтрымання гаспадаркі і быту сям'і, а не «задавальненнем пачуццёвасці і капрызам разгулянай фантазіі, як гэта здаралася ў іншых саслоўях» [12].

Шлюб моладзі сялянскага асяродку ва ўмовах прыгоннага права ў пэўнай ступені залежну ад панскай волі. Свавольства мясцовай адміністрацьшнай і царкоўнай улады часам даходзіла да абсурду. М. Нікіфароўскі падае эпізод вянчання дзесяці пар па дазволу памешчыка: атрымаўшы благаславенны ліст, прычт прызначыў «оптавае» вянчанне на адзін дзень. Падчас цырымонп адбылося замяшанне, пары не ўстанаўліваліся. Царкоўны служачы знайшоў выйсце ў самавольным вызначэнні шлюбных пар, прычым дзве з іх аказаліся не ў тым складзе, што быў указаны панскім дазволам і бацькоўскай згодай, але яны так і засталіся прымўсова звязанымі шлюбны мі абавязкамі на ўсё жыццё [13, с. 17].

Сватаўство, змовіны  і вяселле — асноўныя этапы вясельнага цыкла. Як і ў прывілеяваны х сем'ях, у шлюбнай здзелцы сялянскага асяродку бралі ўдзел абодва бакі: выкуп («вена») па лініі жаніха — пасаг па лініі нявесты. Такім чынам, праблема шлюбу ў сялянскім саслоўі вырашалася з разлікам набыцця працоўных рук і працягу фамільнага роду.

Статыстычныя матэрыялы, сабраныя і апрацаваныя афіцэрамі Генеральнага штаба за 15-гадовы перыяд з 1843 па 1857 г. па Гродзенскай губерні, сведчаць аб даволі стабільних адносінах колькасці шлюбаў да агульнай лічбы народанасялення Еўрапейскай часткі Расіі. Так, у прыватнасці, у 1843—1847 гг. гэта прапорцыя склала 1 на 116 жыхароў губерні, у 1848—1852 гг. — 1 на 107, у 1853—1857 гг. — 1 на 119. Цапкам за 15-гадовы перыяд адзін шлюб прыпадаў на 114 жахароў, а штогод у шлюб уступала 1/57 частка кожнага полу. Аднак мэта збору гэтай інфармацыіі і адпаведнай прадмовы хутчэй за ўсё заключалася ў тым, каб паказаць дысананс паміж колькасцю шлюбаў, статыстыка якіх, дарэчы, мала адрознівалася ад даных паўднёваеўрапсйсюх краін, і непадрыхтаванасцю мясцовага сялянства да вядзення годнага сямейнага жыцця. «Непрадбачлівасць бедных людзей, што заключаюць раннія шлюбы, і няўстрыманасць у шлюбным жыцці павінны  лічыцца такімі ж заганамі, як п'янства і распуста ...шкада таго грамадзяніна, які прыжывае дзяцей раней, чым патурбуецца забяспечыць іх існаванне» [14, с. 558].

Падстаўнасць гэтай заўвагі мае пад сабою гістарычную глебу. Згодна са Статутам, мінімальны шлюбны ўзрост дзяўчыны вызначаўся трынаццаццю гадамі. Для прадстаўніцы прывілеяванага саслоў'я яе асабістая падрыхтаванасць да шлюбу, відаць, важнага значэння не мела, бо яе шлюб фактычна рыхтавалі і ажыццяўлялі бацькі.

Нараджэнне сям'і юрыдычна пачыналася з афіцыйнай рэгістрацыіі шлюбу. Артыкул 1 5-га раздзела Статута 1588 г. вызначаў парадак матэрыяльнага забеспячэння пасагу будучай жонкі маёмасцю будучага мужа. Памер маёмасц, які афіцыйна афармляўся як «вена», падлічваўся на пад ставе нерухомай маёмасц мужа і пасагу жонкі. Агульная сума апошняга па жаночай лініі павінна складаць не менш адной трэці кошту нерухомай маёмасц мужа, які ў сваю чаргу меў права запісаць на жонку «вена» ў памеры адной трэці часткі агульнай маёмасц.

Такім чынам, перад замужжам дзяўчыны народа шляхецкага заканадаўча прадугледжвалася забеспячэнне маёмаснага фундаменту пры ўдзеле двух бакоў. Цікава, што праблема фінансавага нераўнапраўя на гэтай стадьй справы юрыдычна павінна была кампенсавацца сваякамі па лініі буду¬чай жонкі. Згодна з другім артикулам, калі трэцяя частка маёмасц мужа не каштавала падвойнага памеру пасагу дзяўчыны, бацька альбо той, хто будзе выдаваць яе замуж, за грошы, якія жадаў бы ёй даць, павінен быў купіць маёнтак у агульнае карыстанне суджаных [10, с. 403].

У сялянскім асяродку, дзе размова пра грошы і маёмасць вялася выключна ў заможных праслойках, на першы план выходзіла праблема эфектыўнага выкарыстання працоўных рук сям'і для падтрымання

жыццёвага дабрабыту. Да замужжа дачцы маці рупілася падрыхтаваць пасаг: па магчымасці адкладвалася напражанае, натканае, зробленае асабістай працай. У параўнанні з прывілеяванай равесніцай падрыхтоўка да шлюбу дзяўчыны простага саслоўя патрабавала больш часу і прадугледжвала набыццё практычных уменняў і навыкаў. Хаця ні адна, ні другая да трынаццацігадовага ўзросту фізіялагічна не маглі быць падрыхтаваны да шлюбнага жыцця і родаў. Шлюбная ўзроставая ступень, вызначаная Статутам, прыпадае на перыяд дзяцінства, уласна падлеткавы, пераходны этап [15, с. 15].

Н. Я. Нікіфароўскі, асобна вызначыўшы сялянскіх пастухоў і пастушак, заўважае: «Звычайна, калі дзяўчына-падлетак знаходзіцца ў пары фізічнага развіцця, яна пачынае развітвацца з «лялькамі» і зараз (прыблізна 1893 год. — Н. Л.) з'яўляецца ўжо казачным запэўненне, што некаторыя жоны разам з пасагам прывозілі ў дом мужа і цацкі, з якімі працягвалі гуляць. Але 16-гадовая фізічна развітая пастушка яшчэ гуляе ў лялькі, а 15-гадовы пастух возіцца з пяском і бу¬дуе чуркі, г. зн. працягвае тое, з чым даўно расталіся яго аседлыя аднагодкі» [16, с. 121—122].

Паступова мінімальны шлюбны ўзрост павышаўся. У 1830 г. быў выдадзены закон, згодна з якім забаранялася вянчанне хлопцаў, што не дасягнулі 18, а дзяўчат — 16 гадоў [17, с. 67]. У «Зборніку царкоўных і грамадзянскіх законаў» 1903 г. быў пацверджаны гэты нарматыўны

узрост, а таксама вылучаны ўмовы законнасці і сапраўднасці шлюбу. Адным з пунктаў сярод апошніх значылася ўзаемная і беспрымусовая згода маладых на шлюб. Цікава, што жаніх і нявеста не маглі ўзяць шлюб без дазволу бацькоў ці апекуноў, і толькі ў тым выпадку, калі апошнія злоўжывалі сваёй уладай, а маладыя дасягнулі грамадзянскага паўналецця — 21 год, шлюбная працэдура ажыццяўлялася без згоды бацькоў. Такі шлюб прызнаваўся сапраўдным, хаця ў выпадку скаргі бацькоў маладыя маглі быць пакараны, згодна з арты куламі «Уложения о наказании» 1885 года [18, с. 2].

Такім чынам, дэклараваная правам узаемная згода маладых і забарона шлюбаў на падставе бацькоўскага прымусу — радыкальныя заканадаўчыя распрацоўкі, накіраваньтя на стварэнне больш дэмакратычнага мікраклімату ў сем'ях.

Прааналізаваны я этнаграфічны я матэрыялы XIX ст. даюць магчымасць рэканструяваць найбольш тыповыя абставіны , падчас якіх адбывалася знаёмства моладзі сялянскага асяродку. Сумесныя работы ў полі, народныя і царкоўныя святы, ігрышчы, вячоркі, карчма, кірмашы, прошчы спрыялі наладжванню сяброўскіх адносін. Народны погляд на этыкет дашлюбных паводзін хлопцаў і дзяўчат заставаўся непадуладным новым павевам, што пачалі пранікаць у вёску ў другой палове XIX ст. Згодна з правіламі штодзённай маралі, жаніх і асабліва нявеста павінны захоўваць чысціню і цнатлівасць у давясельны час.

Шлюб у сялянскім саслоўі разглядаўся як жыццёвая неабходнасць працягу фамільнага роду, патрэба ў свежых сілах для падтрымкі гаспадаркі. Умовы заключэння шлюбу ў беларусаў залежылі ад саслоўнай прыналежнасці: асабістая падрыхтаванасць да шлюбу прадстаўніцы шляхецкага паходжання не была дамінуючай, у параўнанні з прывілеяванай равесніцай ад дзяўчыны простага саслоўя патрабавалася набыццё практычных уменняў і навыкаў.

Аналіз артыкулаў сямейнага права дае падставу прасачыць трансфармацыю мадэляў узаемаадносін паміж бацькамі і дзецьмі ў пытаннях шлюбу ад пераважна кансерватыўных да больш дэмакратычных. Узаемная згода маладых і забарона шлюбаў на падставе бацькоўскага пры¬мусу ў якасці ўмоў законнасці і сапраўднасці шлюбу сведчаць пра ўзрастанне асабістай адказнасці суджаных падчас стварэння сям'і.

Summary

Most typical acquaintance procedures of young Belarusian peasants in 19 century are reconstructed. Effect of conventional morals on pre-marriage behavior patterns of guys and girls is traced. Conditions for contracting marriages of Belarusian nobility and common folk are analyzed. Parent-children relationship models with respect to marriage tended to transform from conservative to more democratic.

Літаратура

1. Ш е й н П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб., 1902. Т. 3.
2. Ш п и л е в с к и й П. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. СПб., 1858.
3. Ш п и л е в с к и й П. Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических ее сказках // Пантеон. СПб., 1853. Кн. 7.
4. Сборник сведений для изучения быта крестьянского населения России (обычное право, обряды, верования и пр.) / Под ред. Н. Харузина. М., 1889.
5. Д о в н а р - З а п о л ь с к и й М. В. Заметки по белорусской этнографии // Живая старина. СПб., 1893. Вып. 2.
6. К и р к о р А. Этнографический взгляд на Виленскую губернию. СПб.,1858.
7. Б о г д а н о в и ч А. Е. Мои воспоминания // Неман. 1994. № 8.
8. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба / Под ред. М. Цебрикова. СПб., 1862.
9. К р а ч к о в с к и й Ю. Ф. Быт западно-русского селянина. М., 1874.
10. Статут Великого княжества Литовского 1588 г. Мн., 1989.
11. Россия. Полное географическое описание нашего отечества / Под ред. А. Семенова. СПб., 1905. Т. 9.
12. Ш у м о в и ч А. Свадебные обычаи и обряды простонародья Борисовского уезда Минской губернии // Минские губернские ведомости. 1865. 22 окт. С. 456.
13. Н и к и ф о р о в с к и й Н. Н. Очерки Витебской Белоруссии: Бабы, або жонки // Этнографическое обозрение. 1898. № 2.
14. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба / Под ред. П. Бобровского. СПб., 1863.
15. Р а к а в а Л. В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы. Мн., 2000.

16. Н и к и ф о р о в с к и й Н. Н. Очерки Витебской Белоруссии: Пособники жихара // Этнографическое обозрение. 1893. № 2.
17. Сям'я і сямейны быт беларуса / Пад рэд. В. Бандарчыка. Мн., 1990.
18. Г р и г о р о в с к и й С. Сборник церковных и гражданских законов о браке и разводе и судопроизводство по делам брачным. СПб., 1903.